*А.В.ЖУРАЎ*

# КАНЦЭРТНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ БЕЛАРУСКАГА АНСАМБЛЯ ПЕСНІ І ТАНЦА Ў ПЕРЫЯД ВАЙНЫ

Незадоўга да пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў Беластоку быў арганізаваны і распачаў плённую працу Беларускі ансамбль песні і танца пад кіраўніцтвам выдатнага знаўцы беларускага песеннага фальклору Рыгора Раманавіча Шырмы, у якога на той час было запісана звыш тысячы народных песень. Ансамбль складаўся з харавой і танцавальнай груп, а таксама групы музычнага суправаджэння. Харэаграфіяй займаўся вядомы ў той час балетмайстар і этнограф Іван Хвораст.

У ансамблі ўдзельнічалі шмат выкладчыкаў спеваў, якія працавалі і адначасова вучыліся ва універсітэтах Варшавы і Вільні, у духоўных семінарыях. Ансамбль наведвала моладзь з аматарскіх калектываў. Працавалі шмат. Працоўны дзень іншы раз доўжыўся больш за сем гадзін. А потым Рыгор Раманавіч са сваёй неразлучнай скрыпачкай, на якой добра іграў, займаўся па некалькі гадзін то з жаночай, то з мужчынскай групай аж да позняй ночы. Такая напружаная праца неўзабаве дала вынікі. Быў створаны складаны і цікавы харавы і танцавальны рэпертуар. Артысты адчувалі добрую падрыхтоўку і імкнуліся як мага хутчэй выступіць на прафесійнай сцэне.

*Беларускі ансамбль песні і танца. 1941 г.*



Іх мары здзейсніліся 23 лютага 1940 г. У Беластоку, у Доме Чырвонай Арміі, адбыўся першы канцэрт. Ён быў наладжаны для воінаў мясцовага гарнізона. У праграму канцэрта Р.Шырма ўключыў папулярныя на той час песні і танцы, такія як “Песня аб Сталіне” (муз. А.Аляксандрава), беларускія народныя песні “Ой, загуду” (у апрацоўцы М.Гайваронскага), “Там за садамі” (у апрацоўцы А.Кошыца), класічныя харавыя творы “Соловушка” і “Ночевала тучка” (муз. П.Чайкоўскага), “Молодёжная песня” (муз. І.Дунаеўскага), а таксама беларускія танцы “Лявоніха”, “Крыжачок”, “Лянок”, “Мяцеліца” і інш. Канцэрт прайшоў з вялікім поспехам.

За 1940 г. ансамблем было дадзена больш за 170 канцэртаў. Пасля выступленняў у гарадах і вёсках Заходняй Беларусі, а таксама шэрага канцэртаў у сталіцы Беларусі ў прадстаўнікоў улады і знаўцаў харавога і харэаграфічнага мастацтва аб калектыве склалася добрае ўражанне. Пра яго паспяховыя выступленні сталі пісаць газеты і з захапленнем гаварыць слухачы. Грунтоўная падрыхтоўка канцэртнай праграмы працягвалася. 15 мая 1941 г. мастацкі калектыў накіраваўся ў першую гастрольную паездку ў Маскву. Важнымі і адказнымі былі для маладога калектыву гэтыя гастролі ў сталіцы Савецкай дзяржавы. У першыя ж дні сваімі выступленнямі перад працоўнымі Масквы ансамбль песні і танца прадэманстраваў высокую выканальніцкую культуру. Натхнёна і праўдзіва перадавалі ўдзельнікі ансамбля самабытнасць і прыгажосць беларускай народнай песні, яе чысціню, свежасць і мілагучнасць. Канцэрты праходзілі ў Цэнтральным Доме работнікаў мастацтва, у Канцэртнай зале імя П.Чайкоўскага, на сельскагаспадарчай выставе, у парку культуры і адпачынку імя М.Горкага, на Усесаюзным радыё. Беларускія артысты сустрэліся з калектывамі ансамбляў імя М.Пятніцкага і імя А.Аляксандрава, з Ігарам Маісеевым, якога вельмі

зацікавіў беларускі народны танец. Пасля выступленняў і сустрэч у Маскве калектыву гастраляваў па гарадах Расійскай Федэрацыі.

Вайна застала ансамбль у г. Арле. 23 чэрвеня ў другой палове дня артыстаў тэрмінова выклікалі ў Маскву для стварэння новай канцэртнай праграмы з мэтай культурнага абслугоўвання салдат і працоўных тылу ў ваенны час. 27 чэрвеня, праз пяць дзён напружаных рэпетыцый, ансамбль пачаў сваю канцэртную дзейнасць з новай праграмай. Першым было выступленне на прызыўным пункце г. Масквы. 29 чэрвеня 1941 г. канцэрт адбыўся ў Крамлёўскім тэатры для работнікаў НКУС і ў той жа дзень вечарам на зборным пункце. Ансамбль абслугоўваў ваенкаматы Масквы, Маскоўскай вобласці, а таксама вайсковыя часці, якія прыбывалі ў Маскву. Рыгор Раманавіч пастаянна трымаў сувязь з вядомымі кампазітарамі Савецкага Саюза І.Дунаеўскім, А.Новікавым, М.Блантэрам і іншымі, тэрмінова ўзбагачаў рэпертуар новымі творамі ваеннай тэматыкі.

У сярэдзіне ліпеня 1941 г. ансамбль разам з іншымі творчымі калектывамі Масквы быў эвакуіраваны ў Сібір. Артысты ансамбля былі расквятараваны ў г.Краснаярску і ўжо 20 ліпеня 1941 г. далі канцэрт у чыгуначным клубе горада для воінаў Чырвонай Арміі, якіх адпраўлялі на фронт. У Краснаярску штодзённа ў вольны ад канцэртаў час калектывам вялася карпатлівая праца па стварэнні новай праграмы на тэмы сучаснасці, другое аддзяленне якой склаў тэатралізаваны мантаж на тэксты паэтаў У.Раждзественскага і К.Лісоўскага. Рэжысёрам быў А.Данілевіч. Пасля паспяховага прыёму мантажу мастацкай камісіяй ансамблю выдзелілі два маленькія таварныя вагончыкі і накіравалі на гастролі ў гарады Канск, Тайшэт, Усць-Арда, Чыта, Чарамхоў,Зіма, Іркуцк і інш.

6 кастрычніка 1941 г. калектыў быў адпраўлены ў Сярэднюю Азію і выступаў з канцэртамі ў Сяміпалацінску (11.10.1941), Алма-Аце (30.10.1941), Фрунзе (23.10.1941), Чымкенце (11.12.1941), Ташкенце (26.12.1941), Самаркандзе (28.01.1942), Сталінабадзе (19.02.1942), Ашхабадзе (24.03.1942), Краснаводску (18.04.1942), Фергане (14.05.1942). Ансамбль песні і танца за час знаходжання ў Сярэдняй Азіі выступіў больш чым у 176 гарадах, раённых цэнтрах, пасёлках і даў звыш за 218 канцэртаў.

Незабыўнай для артыстаў стала сустрэча з Якубам Коласам, якая адбылася 6 чэрвеня 1942 г. у Ташкенце. Калектыў выступаў у гарадскім парку. Па заканчэнні канцэрта з глядзельнай залы да сцэны накіраваўся чалавек. Выбухнулі моцныя апладысменты, бо гэтым чалавекам быў наш знакаміты зямляк Якуб Колас. Артысты кінуліся насустрач яму. Пачаліся абдымкі і віншаванні са слязамі на вачах. Потым за сцэнаю, пасля таго як мінуліся першыя ўсплескі радасці, прывітанні, пачаліся размовы і ўспаміны.

“Дарагія землякі, – звярнуўся да калектыву народны паэт Беларусі, – вялікае Вам дзякуй за цудоўныя песні, якія так шчыра, ад душы вы праспявалі. Слухаючы вас, я сёння як быццам пабываў на Радзіме. Вялікае дзякуй і да хуткай сустрэчы ў роднай Беларусі”. Наступная сустрэча са славутым паэтам адбылася толькі пасля вайны на дэкадзе беларускай літаратуры і мастацтва ў Маскве ў 1949 г.

16 чэрвеня 1942 г. пасля працяглых гастроляў па рэспубліках Сярэдняй Азіі ансамбль песні і танца накіравалі ў г.Навасібірск, дзе 30 чэрвеня ў зале філармоніі калектыў даў першы канцэрт для чырвонаармейцаў і гараджан. Прайшоў ён на вялікім мастацкім узроўні, пад шквальныя апладысменты гледачоў. Да гэтага канцэрта калектыў падрыхтаваў шмат новых танцаў і песень, такіх як “Самовары-самопалы” (муз. А.Новікава), “Вечер на рейде” (муз. В.Салаўёва-Сядога), “Сулiко” і інш. Р.Шырма ўмеў падбіраць рэпертуар, адчуваў яго змест. Ён заўсёды ўгадваў густ слухачоў. А галоўнае, імкнуўся, каб рэпертуар ансамбля адпавядаў патрабаванням часу, перажываннямі кожнага са слухачоў, каб ён выклікаў пачуцці глыбокага патрыятызму і любові да Айчыны.

30 верасня 1942 г. у г. Навасібірску ў зале філармоніі адбылася памятная сустрэча калектыву ансамбля з прадстаўнікамі беларускіх партызан На гэтым канцэрце партызаны падарылі ансамблю акардэон, які ў якасці трафея яны захапілі ў фашыстаў пасля бою на рацэ Заходняй Дзвіне ў раёне Суража. З гэтым акардэонам калектыў ансамбля музыкай, песнямі і танцамі натхняў воінаў на перамогу над ворагам, даваў ім магчымасць (хоць у час канцэрта) забыць цяжар франтавых будняў. Пасля вайны акардэон быў перададзены ў музей Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску, дзе знаходзіцца і зараз.

16 чэрвеня 1943 г. ансамбль песні і танца накіроўваецца ў г. Данілаў Яраслаўскай вобласці. Адсюль ён выязджаў на канцэрты і ў шматлікія сёлы, райцэнтры, у Маскву, на ваенныя заводы і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фабрыкі, у вайсковыя часці. У гэты перыяд хору ўпершыню была дадзена магчымасць зрабіць фондавы запіс на магнітную стужку ў Доме гуказапісу, выступіць па радыё. За час знаходжання ў г. Данілаве ансамбль даў 31 канцэрт.

Пасля перамогі Савецкай Арміі пад Сталінградам фронт паглыбіўся ў некаторых кірунках на 600–700 км на захад. Пачалося масавае вызваленне нашай краіны. Перамогу пад Сталінградам замацаваў разгром акупантаў пад Курскам. Ініцыятыва ў ходзе Вялікай Айчыннай вайны цалкам перайшла да Чырвонай Арміі.

Лінія фронту набліжалася да меж Беларусі. Да доўгачаканай сустрэчы з Бацькаўшчынай калектыў ансамбля рыхтаваў новую праграму. За кароткі час было падрыхтавана аддзяленне з твораў у выкананні мужчынскай групы хору, нумароў жаночай групы, салістаў. 18 снежня 1944 г. у г. Рыбінску ў Палацы культуры адбыўся ўрадавы прагляд новай праграмы ансамбля, разлічаны на абслугоўванне часцей Чырвонай Арміі і жыхароў вызваленых ад фашыстаў раёнаў Савецкай Беларусі. Праз некалькі дзён ансамбль быў накіраваны ў вызвалены Гомель для выканання сваёй пачэснай і ганаровай задачы. Першы канцэрт на тэрыторыі Беларусі адбыўся ў Нова-Беліцы 1 студзеня 1944 г., ён быў прысвечаны 25-годдзю ўтварэння БССР. Да пераезду ў Мінск ансамбль працаваў і даваў канцэрты ў клубе Нова-Беліцкай запалкавай фабрыкі, які цудам уцалеў. Часта канцэрты праходзілі пад акампанемент варожых бомбаў (фронт знаходзіўся побач з Нова-Беліцай).

Аднаго разу ў час канцэрта, на якім прысутнічалі камандуючы фронтам К.К.Ракасоўскі і камандзір партызанскага злучэння В.І.Казлоў, наляцелі нямецкія самалёты. Навокал стаяў гул ад выбухаў бомбаў, дрыжэлі падлога, сцены клуба, але ніхто не звяртаў на гэта ўвагі, і канцэрт працягваўся, быццам нічога страшнага не адбывалася, а Рыгор Раманавіч нават і не заўважыў гэтага. Потым, пасля канцэрта, спытаў у спевакоў: “Чаго гэта Вы былі быццам спалоханыя?.. Зіркалі вачыма ў бакі...”

За кароткі час з 1 студзеня па 9 чэрвеня 1944 г. на вызваленай тэрыторыі Беларусі ансамблем было дадзена больш за 120 канцэртаў.

Пасля вызвалення Мінска калектыў накіравалі ў сталіцу Беларусі, дзе дыміліся руіны і адчуваўся пах пораху. Радасці не было канца. Артысты сустрэліся са сваімі роднымі, блізкімі і знаёмымі.

14 ліпеня 1944 г. у Мінску адбыўся парад, на якім калонамі перад трыбунай прайшлі каля 40 тысяч беларускіх партызан. Ганаровымі гасцямі на трыбуне былі і артысты ансамбля разам са сваім кіраўніком Рыгорам Раманавічам Шырмам. Пасля параду адбыўся вялізны святочны канцэрт з удзелам ансамбля. Упершыню партызаны маглі спакойна слухаць канцэрт і радавацца танцам, песням і яркаму сонейку.

Дзень Перамогі ансамбль песні і танца сустрэў у Гродне, куды ён быў накіраваны на пастаянную працу. Урачысты святочны канцэрт у гонар Перамогі над фашысцкай Германіяй адбыўся 9 мая 1945 г. у гарадскім драматычным тэатры. Перад аўдыторыяй выступіў ансамбль з новай святочнай праграмай, у якой упершыню быў паказаны гледачам літаратурна-музычны мантаж вядомага рэжысёра А.Саннікава “Савецкая Беларусь”. Канцэрт прайшоў на вялікім мастацкім і эмацыянальным уздыме.

Беларускі ансамбль песні і танца пад кіраўніцтвам Р.Р.Шырмы сваім высокапрафесійным мастацтвам унёс значны ўклад у перамогу над фашысцкай Германіяй. У цяжкі для краіны час ён даў больш за 840 канцэртаў і пабываў прыкладна ў 580 гарадах і раённых цэнтрах СССР.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ